Не летнікам адзіным

# ЗДАЦЬ НА «РАЗРАД»,
## або Па законах скаўтаў

**У студзені 1988 года некалькі энтузіястаў, якія прачыталі ў адной з газет нататку пра малавядомы ў нас на той момант рух скаўтаў, сабралі ў сталічным парку імя Горкага невялікую групу дзяцей. Вынікам сустрэчы стала стварэнне першага беларускага скаўцкага патруля «Арлы», у складзе якога было дзевяць чалавек. А ўжо ў канцы года ў Мінску з'явілася і першая дружына пад назвай «Форт-Няміга». Чым сёння жыве арганізацыя, як стаць яе членам і што такое здача «на пяро», «Чырвонцы. Чырвонай змене» расказала камісар па навучанні і трэнінгу Беларускай рэспубліканскай скаўцкай асацыяцыі (БРСА) Марыя ЖУК.**


Абавязковая ранішняя працэдура ў летніку — пастраенне.

### Калі рух зацягвае

— Сама я далучылася да руху ў 1997 годзе ва ўзросце 11 гадоў, — усміхаецца Марыя. — Вучылася ў школе, і да нас прыйшоў адзін з лідараў арганізацыі, які расказаў пра тое, чым у іх займаюцца хлопцы і дзяўчаты. Як толькі я пачула словы «вогнішчы, палаткі, паходы», то зразумела, што гэта маё. Кожнае лета ў дзяцінстве праводзіла ў вёсцы ці на лецішчы, мне гэта падабалася, таму ідэя захапіла. Праўда, на першых занятках трохі здзівілася — мы нікуды не пайшлі, а замест гэтага пачалі разбірацца з асновамі скаўтынга: вывучылі гісторыю арганізацыі, яе законы, замалёўвалі вузлы, вывучалі віды вогнішчаў, удзельнічалі ў развівальных гульнях. Так прайшоў цэлы год, і толькі потым, калі кожны меў тоўсты спісаны сшытак з тэорыяй, мы ўпершыню адправіліся ў летнік.

**Скаўцкая арганізацыя сёння — гэта больш за 1,1 тысячы ўдзельнікаў па ўсёй краіне: як дарослых, так і дзяцей.**

У 11 класе Марыя стварыла ўласны патруль — на працягу года ён актыўна дзейнічаў: хадзіў у паходы, на выстаўкі, ездзіў на экскурсіі. «Скаўцкі рух — гэта не толькі летнікі, ён накіраваны на развіццё ўсёй асобы: ведаў, уменняў, інтэлектуальных і духоўных каштоўнасцяў», — сцвярджае дзяўчына. Але пасля паступлення ў інстытут студэнцкае жыццё настолькі зацягнула Марыю, што ад скаўцтва прыйшлося адмовіцца. Вярнулася выпадкова — на 20-годдзе арганізацыі былую актывістку запрасілі прыняць удзел ва ўрачыстых мерапрыемствах, і пасля візіту яна зразумела, што не можа без гэтага жыць. У другі раз дзяўчына прыйшла на «дарослую» пасаду — пачала ўдзельнічаць у навучанні моладзі, праводзіла семінары і трэнінгі для лідараў.

— Цяпер я распрацоўваю комплексную сістэму работы з дарослымі, — кажа камісар. — У Сусветнай скаўцкай арганізацыі ёсць свае патрабаванні да гэтага, і мы імкнёмся ім адпавядаць. Гэта не так проста, бо скаўтынг — валанцёрская дзейнасць, грошай за яе не атрымліваюць, праграма скіравана на развіццё асобаснага росту. Звычайна дарослыя працуюць у трох кірунках: непасрэдна работа з дзецьмі (кіраўніцтва атрадамі і дружынамі), з іншымі дарослымі (арганізацыйная падтрымка, трэнінгі) і работа ў структуры арганізацыі (у якасці сакратароў, бухгалтараў і гэтак далей).


Нямногія ведаюць, што Віфлеемскі агонь у Беларусь прывозяць менавіта скаўты.

### Ад квэстаў да балю

— Мы робім шмат спраў апроч арганізацыі летнікаў, пра якія многія ведаюць, — сцвярджае Марыя. — Цэнтральнае месца ў нашым руху займаюць абяцанні і законы, вакол іх усё і будуецца. Але і прырода — вельмі важны элемент, мы хочам, каб моладзь вучылася жыць у гармоніі з ёй. Тым больш гэта актуальна для сучасных хлопчыкаў і дзяўчатак, якія часам у дзесяцігадовым узросце бачылі жывёл толькі на малюнках. Але выезды ў лес — далёка не адзіны элемент нашай работы. На працягу года мы збіраемся на базе школ, цэнтраў дзіцячай творчасці і прыдумляем новыя праекты. Гэта могуць быць і гарадскія квэсты, і сацыяльныя акцыі (напрыклад, кожную вясну мы ўдзельнічаем у Тыдні лесу, які арганізуе Міністэрства лясной гаспадаркі, — пад Стоўбцамі за гэтыя гады вырас цэлы «скаўцкі» лес у некалькі гектараў), і перадача Віфлеемскага агню, які па краінах свету развозяць скаўты. А яшчэ ёсць скаўцкі баль — вельмі прыгожае мерапрыемства, якое мы праводзім напярэдадні Новага года. Арандуем залу ў Палацы дзяцей і моладзі, а хлопцы і дзяўчаты самі, без удзелу прафесіяналаў, праводзяць рэпетыцыі, падбіраюць танцы (як класічныя, так і сучасныя), ну а потым — выступаюць.

Скаўцкая арганізацыя сёння — гэта больш за 1,1 тысячы ўдзельнікаў па ўсёй краіне: як дарослых, так і дзяцей. Самыя вялікія падраздзяленні дзейнічаюць у Мінскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцях. Асобна можна вылучыць добра вядомую сярод беларускіх скаўтаў Смаргонскую дружыну, якая нядаўна адзначыла сваё дваццацігоддзе. На ўсходзе краіны дзейнічаюць пераважна невялікія групы. Далучыцца да арганізацыі проста, калі ў населеным пункце ўжо існуе атрад. Трэба звязацца з сакратаром або галоўным скаўтам і прыйсці на заняткі. Ад дзіцяці патрабуецца толькі жаданне і заява аб уступленні ў арганізацыю, а таксама ўступны ўнёсак у памеры 15 рублёў (далей штогод трэба плаціць па 10 рублёў). Калі да месца дыслакацыі найбліжэйшай дружыны далёка, адзіны варыянт — стварыць уласную. Але гэта не так проста — трэба мець хоць бы двух ці трох дарослых, якія пагодзяцца ахвяраваць часткай свайго вольнага часу. Марына прызнаецца, што ў арганізацыі застаюцца не ўсе, — калі размова заходзіць пра скаўцкія законы і традыцыі, нехта разумее, што гэта не ягое.


Добрае вогнішча арганізуе толькі сапраўдны майстар!

**«Іх задача — увесь час маўчаць, пераначаваць і вярнуцца ў лагер. Есці можна толькі тое, што знойдуць у лесе, напрыклад ягады».**

### Навошта «ваўчанятам» пёры?

— Лагер — цэнтральнае мерапрыемства летняй кампаніі, — расказвае Марыя. — Мы арганізуем іх ужо шмат гадоў, таму ніякіх асаблівых складанасцяў не ўзнікае. Цяпер прыходзім да таго, каб гэта мерапрыемства праходзіла ў выглядзе Джамбары — сусветнага скаўцкага злёту, які штогод праводзіцца ў розных краінах свету. Ёсць падобныя мерапрыемствы на рэгіянальным узроўні (напрыклад, у нашым, Еўразійскім, удзельнічаюць дзевяць краін). Беларускі скаўцкі лагер — гэта фактычна нацыянальны Джамбары — на яго прыязджаюць дзеці з усіх куткоў краіны. Удзел у мерапрыемстве бяруць 200—250 чалавек.

Вялікую частку часу ў лагеры займаюць штодзённыя справы: гатаванне ежы, нарыхтоўка дроў, дзяжурства. Але паралельна таксама праходзяць заняткі. Дзеці і падлеткі працягваюць вывучаць тэорыю і асвойваць скаўцкія спецыяльнасці. Прычым гендарная прыналежнасць амаль не мае значэння: ёсць як дзяўчаты, што выдатна асвоілі піянерынг (тэхніку стварэння разнастайных будынкаў з вяровак і жэрдак), так і хлопцы, якія добра кухараць. Акрамя гэтага, вялікую частку часу займаюць гульні: «Астравы», «Свісток», «Кім». Нярэдка вячэрнія пасядзелкі каля вогнішча змяняюцца «Жураўлямі і кропкамі», калі кожны атрад рыхтуе сваё выступленне, у якім расказвае пра падзеі дня (гэта можа быць перароблена песня, гумарыстычны нумар ці танец), а кожнае выступленне замест апладысментаў вітаецца гучнымі крычалкамі.

**«Цэнтральнае месца ў нашым руху займаюць абяцанні і законы, вакол іх усё і будуецца. Але і прырода — вельмі важны элемент, мы хочам, каб моладзь вучылася жыць у гармоніі з ёй».**


Скаўцкай маскіроўцы падчас гульняў пазайздросцілі б і сапраўдныя індзейцы!

— Ёсць яшчэ «здача на разрад», — расказвае Марыя. — Для кожнага ўзросту ў нас прапісаны мэты развіцця, яны пазначаны ў рабочых сшытках, якія выдаюць скаўтам. Так, для «ваўчанят» і «ваверчанят» (хлопчыкаў і дзяўчатак 6—10 гадоў) гэта і практычныя ўменні, напрыклад раскладанне пэўных відаў вогнішчаў, і агульначалавечыя — скажам, «не засмучацца пры паразе». Дарослыя назіраюць за тым, як дзеці ўсё гэта выконваюць, а пасля група абмяркоўвае, ці сапраўды ўдзельнік дасягнуў сваёй мэты. Калі ўсе згодны, — у сшытку ставіцца паметка, а калі ўсе паметкі сабраны, скаўту прысвойваецца новае званне і ўручаецца спецыяльны знак.

Нельга не сказаць і пра выпрабаванні. Многія скаўты адгукаюцца на запрашэнні праверыць свае здольнасці ў розных кірунках. Адзін з такіх конкурсаў — «бумеранг». Яго сутнасць у тым, што дарослы разам з дзіцем, вочы якога завязаны, адыходзіць на пэўную адлегласць ад лагера. Падлетку трэба сарыентавацца на мясцовасці, зразумець, дзе ён знаходзіцца, і вярнуцца ў каманду. Дарослы пры гэтым, вядома, толькі назірае, але не дапамагае.

Ці яшчэ адзін прыклад — «пёры». «Адно пяро» — гэта простая «маўчанка», якую здаюць малодшыя, — трэба некалькі гадзін нічога не гаварыць. Для старэйшых (ад 12 гадоў) заданне больш складанае: скаўты бяруць мінімальны набор патрэбных рэчаў (запалкі, ваду, нож, вяроўку і спальнік або турыстычны дыванок на выбар) і групай ідуць у лес на адну ноч. Іх задача — увесь час маўчаць, пераначаваць і вярнуцца ў лагер. Есці можна толькі тое, што знойдуць у лесе, напрыклад ягады. За гэтым выпрабаваннем таксама сочаць дарослыя. Паводле слоў Мары, самае складанае ў «здачы на пяро» — не прагаварыцца, большасць «гарыць» якраз на гэтым.


Выдатная магчымасць адплаціць прыродзе, якая летам становіцца другім домам, — удзел у Тыдні лесу.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.